# Інфармацыйная гадзіна як сродак выхавання малодшых школьнікаў

Цудоўны скарб у творчасці народнай
Для нас сабраны мудрымі дзядамі.
Яго адкінуць — значыць без пашаны
Паставіцца да продкаў працавітых.
*Уладзімір Дубоўка*

З бацькоўскага парога, з першага матчынага слова пачынаецца наша Радзіма, пачынаецца нават нешта большае, што суправаджае нас усё жыццё: любоў да бацькаўшчыны, да гістарычнай спадчыны, да дасягненняў нашых продкаў... Усё гэта — добрае, светлае, чалавечнае — ідзе з сям'і і школы.

Культурная самабытнасць — гэта назапашаная гістарычна-творчым досведам народа цэласная, гарманічная сістэма пэўных пазітыўных ведаў і вобразаў, дзякуючы якім пазнаецца (і пераўтвараецца) свет. Культурная самабытнасць выяўляе сілу народнага патэнцыялу ў сацыяльна-творчай сферы, стварае магчымасць для гістарычна-культурнага разгортвання ўсёй панарамы нацыянальнага быцця, забяспечвае фактычна не толькі сацыяльна-культурны прагрэс, але і само існаванне нацыі.

Беларусь мае багатую гістарычную і культурную спадчыну, што фарміравалася стагоддзямі і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Нягледзячы на разбуральныя войны, грамадства памнажала дасягненні продкаў, павышала свой культурны ўзровень. Сукупнасць гістарычнай, духоўнай і культурнай спадчыны — гэта і ёсць нацыянальнае багацце.

У выхаванні вучняў асаблівае месца адводзіцца інфармацыйна-прапагандысцкай рабоце: правядзенню інфармацыйных гадзін, прагляду хранікальна-дакументальных фільмаў, прысвечаных дасягненням нашай краіны.

Галоўнае, каб кожны вучань пасля такіх мерапрыемстваў адчуў сябе адказным грамадзянінам краіны, ад якога залежыць шчаслівая будучыня нашай Радзімы, бо мэта інфармацыйна-прапагандысцкай дзейнасці ў навучальнай установе — далучэнне да самабытнай культуры свайго народа.

Па колькасці разглядаемых тэм і глыбіні праблемы інфармацыйныя гадзіны падзяляюцца на два асноўныя віды: аглядавыя і тэматычныя.

**Аглядавая** інфармацыйная гадзіна — гэта кароткі агляд асноўных палітычных, культурных і спартыўных падзей, якія адбыліся за пэўны час у краіне і за яе межамі.

**Тэматычная** інфармацыйная гадзіна праводзіцца пры неабходнасці абмеркавання якой-небудзь надзённай праблемы.

**Этапы арганізацыі і правядзення інфармацыйных гадзін.**

**1. Этап падрыхтоўкі.**

Мэта: выбар вядучага і размеркаванне падтэм інфармацыйнай гадзіны паміж яе ўдзельнікамі.

**2. Этап правядзення.**

Мэта: раскрыццё тэмы, абмеркаванне праблемы, вырашэнне выхаваўчых задач.

У ролі вядучага інфармацыйнай гадзіны выступаю і я, і мае вучні (вучні майго класа, дзе я з'яўляюся класным кіраўніком, і вучні тых класаў, дзе я настаўнік беларускай мовы і літаратуры). Але вядучым можа быць і любы вучань, які сам выказаў жаданне выступіць у гэтай ролі па прычыне актуальнасці (менавіта для яго) нейкай разглядаемай праблемы, тэмы.

На этапе падрыхтоўкі мы падбіраем матэрыял, распрацоўваем пытанні, канкрэтызуем тэму. Напярэдадні правядзення інфармацыйнай гадзіны я праводжу індывідуальныя кансультацыі для дапамогі ў адпрацоўцы прыёмаў падачы матэрыялу.

Далей удакладняем мэту і план правядзення інфармацыйнай гадзіны. Улічваючы вялікае выхаваўчае значэнне наглядных сродкаў, мы (на аснове адабранага і сістэматызаванага матэрыялу) да кожнай інфармацыйнай гадзіны рыхтуем мультымедыйную прэзентацыю з выкарыстаннем багатага ілюстрацыйнага матэрыялу (фота, відэа). Немалаважнае значэнне мае фонавы музычны матэрыял, які ўздзейнічае на слухачоў эмацыянальна.

Пасля завяршэння работы мы абавязкова падводзім агульны вынік інфармацыйнай гадзіны, абмяркоўваем план падрыхтоўкі да наступнай сустрэчы.

Пры правядзенні інфармацыйнай гадзіны важна не столькі надаць увагу звесткам пра тыя ці іншыя падзеі, колькі абудзіць да яе цікавасць, прымусіць задумацца.

Сумесна з маімі вучнямі мы распрацоўваем тэматыку інфармацыйных гадзін на кожную чвэрць, збіраем інфармацыю і наглядны матэрыял у выглядзе фотаздымкаў, аўдыёзапісаў, дакументальных стужак. Сістэматызаваўшы матэрыял, сабраны намі, мы ствараем мультымедыйныя прэзентацыі і пішам сцэнарый інфармацыйнай гадзіны.

Штогод у пачатку навучальнага года мы сумесна з вучнямі плануем сваю дзейнасць па папулярызацыі і прапагандзе гістарычнай і культурнай спадчыны Беларусі. Такім чынам, сумесная работа з класнымі кіраўнікамі дазваляе ахапіць усе напрамкі выхаваўча-асветніцкай дзейнасці школы.

Прапаную вашай увазе тэматыку інфармацыйных гадзін на прыкладзе 2017/2018 навучальнага года.

**Верасень.**
06.09. «Чуд, імя якому — кніга» (Дзень беларускай пісьменнасці).
13.09. «Храм ведаў і навукі» (Дзень бібліятэкі).
20.09. «Правілы дарожнага руху — выконвай!» (у рамках акцыі «Дзеці ідуць у школу»).
27.09. «Экатурызм Беларусі» (Сусветны дзень турызму).

**Кастрычнік.**
04.10. «Музыка ў камені» (Сусветны дзень архітэктуры).
11.10. «Мама — галоўнае слова ў жыцці кожнага» (Дзень маці).
18.10. «Запаведны напеў» (гісторыя стварэння Нацыянальнага парка «Белавежская пушча»).
25.10. «Гістарычныя месцы Рэспублікі Беларусь» (аглядавая інфармацыйная гадзіна).

**Лістапад.**
08.11. «Культурнае жыццё сталіцы» (аглядавае знаёмства з музеямі і тэатрамі).
15.11. «Зрабі свой выбар!» (прапаганда здаровага ладу жыцця).
22.11. «Свет вакол нас» (аглядавая інфармацыйная гадзіна).
29.11. «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі».

**Снежань.**
06.12. «Тваё здароўе ў тваіх руках...» (прафілактыка прастудных захворванняў).
13.12. «Падводзім вынікі года» (навіны раёна, горада, рэспублікі).
20.12. «Прыйшлі Каляды — усе людзі рады!»

**Студзень.**
10.01. «Зямля пад белымі крыламі» (Дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў).
17.01. «Папярэджаны — значыць узброены» (правілы бяспечных паводзін зімой).
24.01. «Учынкі — правіны — злачынствы» (прававое выхаванне малодшых школьнікаў).
31.01. «Знешні выгляд вучня — візітная картка школы».

**Люты.**
07.02. «Дасягненні беларускай навукі» (дзень навукі).
14.02. «Спартыўны Мінск» (завочнае наведванне спартыўных пляцовак сталіцы).
21.02. «Мова — жывая памяць народа» (Міжнародны дзень роднай мовы).
28.02. «Мінск — цэнтр ведаў і навукі» (гісторыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі).

**Сакавік.**
07.03. «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь».
14.03. «Канстытуцыя — асноўны закон дзяржавы» (Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).
21.03. «Сінявокая Беларусь» (Сусветны дзень водных рэсурсаў).

**Красавік.**
04.04. «Вялікія спартсмены нашай краіны» (Міжнародны дзень спорту).
11.04. «Падарожжа ў Вітамінію» (асновы здаровага харчавання).
18.04. «Дзень нараджэння Фрунзенскага раёна».
25.04. «Чарнобыль. Вынікі страшнай трагедыі» (Дзень памяці Чарнобыльскай трагедыі).

**Май.**
02.05. «Паклонімся вялікім тым гадам...» (агляд падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны).
16.05. «Іх імёнамі названы вуліцы горада».
23.05. «Скарбніцы эпох» (Міжнародны дзень музеяў).
30.05. «Дзень славянскай пісьменнасці і культуры».

На 2018/2019 навучальны год тэматыка інфармацыйных гадзін будзе папаўняцца з улікам памятных і каляндарных дат Беларусі.

Як паказвае вопыт, сістэма работы па падрыхтоўцы і правядзенні інфармацыйных гадзін дазваляе дасягнуць жадаемага выніку па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў.

На падставе вышэйапісанага магу сцвярджаць, што:

- да кожнай інфармацыйнай гадзіны неабходна рыхтавацца старанна і грунтоўна;
- сканцэнтраванасць на галоўным, самым важным дазваляе паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы;
- неабходна выкарыстоўваць разнастайныя формы дэманстрацыі матэрыялу для падтрымкі зацікаўленасці вучняў;
- поспех любой дзейнасці — у старанным адборы нагляднага матэрыялу да кожнай інфармацыйнай гадзіны;
- да актыўнай дзейнасці неабходна прыцягваць вучняў рознага ўзросту.

# Інфармацыйная гадзіна «Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных месцаў» *(з серыі «Культурная спадчына Беларусі»)*

***Мэта:*** выхаванне ў вучняў нацыянальнай самасвядомасці праз асэнсаванне нацыянальных каштоўнасцей.



***Абсталяванне:*** мультымедыйныя прэзентацыі.

*Інфармацыйную гадзіну пачынае прагляд рэкламнага роліка «Загадкавая Беларусь».*

**Вядучы:** Добры дзень, дзеці і паважаныя госці! Мы рады вітаць вас у гэтай зале і спадзяёмся, што зможам зацікавіць тэмай сённяшняй сустрэчы.

***(Слайд 1.)*** Захаванне гістарычных і культурных каштоўнасцей народаў і нацый з'яўляецца абавязковай умовай прагрэсу і развіцця як асобнага чалавека, так і краіны. ***(Слайд 2.)*** Гэта ідэя пакладзена ў аснову міжнародных пагадненняў і канвенцый па ахове гістарычна-культурнай спадчыны.

***(Слайд 3.)*** Таму ў 1983 годзе Асамблеяй Міжнароднага савета па пытаннях аховы помнікаў і гістарычных месцаў быў устаноўлены Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных месцаў. ***(Слайд 4.)*** Адзначаецца гэты дзень з 18 красавіка 1984 года. Адным з галоўных дакументаў у нашай краіне з'яўляецца Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», прыняты ў студзені 2006 года. ***(Слайд 5.)***

Таямнічая гісторыя Беларусі пакідае нам тысячу загадак. ***(Слайд 6.)*** Мы пазнаём яе сакрэты праз стагоддзі па архітэктурных помніках. ***(Слайд 7.)*** Сярод іх мноства старажытных замкаў, якія быццам заслоны ахоўвалі і абаранялі беларусаў ад варожых нашэсцяў. Замак XIII стагоддзя ў Наваполацку, замак Гедыміна ў Лідзе ***(слайд 8)***, знакамітыя Мірскі і Нясвіжскі замкі ***(слайд 9)***, авеяны легендамі замак у Гальшанах... ***(Слайд 10.)***

***(Слайд 11.)*** Сёння іх старажытныя руіны — гэта напамін аб складанай гісторыі Беларусі — гісторыі дзяржавы, што знаходзіцца на скрыжаванні многіх дарог.

Мы запрашаем вас на завочную экскурсію, у ходзе якой вы пазнаёміцеся з замкамі Беларусі...

*Вучням дэманструецца дакументальная стужка* ***«Замкі Беларусі»*** *(на* ***слайдзе 11*** *націскаецца спасылка на наступную прэзентацыю).*

**Вядучы:** Сёння хацелася б нагадаць вам пра дату, якую ў хуткім часе будуць адзначаць усе, хто неабыякавы да лёсу Зямлі. 22 красавіка — Міжнародны дзень Маці-Зямлі. І мы, канешне, не можам абысці ўвагай гэты факт.

***(Слайд 12.)*** Стагоддзямі на зямлі нараджаліся, жылі і паміралі людзі, пакідаючы пасля сябе памяць, справы, думкі і подзвігі. ***(Слайд 13.)*** Людзі размаўляюць на розных мовах, вераць у розных багоў, а планета Зямля — гэта тое адзінае, што аб'ядноўвае і звязвае ўсіх нас, нашых продкаў і нашых нашчадкаў.

***(Слайд 14.)*** Міжнародны дзень Маці-Зямлі праводзіцца з мэтай аб'яднання ўсіх людзей планеты ў справе абароны навакολля. ***(Слайд 15.)*** Заснавальнікам гэтага Дня лічыцца Джон Мортан, які ў 40-я гады XIX стагоддзя развярнуў кампанію па прапагандзе пасадкі дрэў. З канца XIX стагоддзя гэты дзень адзначаецца штогод. Статус афіцыйнага свята дзень набыў у 1971 годзе. ***(Слайд 16.)***

***(Слайд 17.)*** Зямля — гэта ўсё, што вакол нас. Гэта наша краіна, палі, лясы, лугі, рэкі. ***(Слайд 18.)*** У Дзень Зямлі мы імкнёмся ўсвядоміць каштоўнасць усяго жывога на Зямлі.

Прырода Беларусі надзвычай багатая і разнастайная.

***(Слайд 19.)*** Сапраўдны скарб Беларусі — лясы. Вялікія і малыя, старыя і маладыя, яны займаюць трэцюю частку тэрыторыі краіны. Сасновыя бары і дубровы, яловыя нетры і маляўнічыя бярозавыя гаі, ліпавыя, грабавыя і вольхавыя лясы — усё сустрэнецца тут. Пад іх кронамі знаходзяць сабе прытулак шматлікія звяры і птушкі. ***(Слайд 20.)*** Лось, алень, казуля, дзік, воўк, лісіца — паўсюдныя жыхары беларускіх лясоў. ***(Слайд 21.)***

Для захавання самых унікальных узораў беларускай прыроды створаны нацыянальныя паркі і запаведнікі ***(слайд 22)*** — Белавежская пушча ***(слайд 23)***, Бярэзінскі і Прыпяцкі запаведнікі ***(слайд 24)***, Браслаўскі ***(слайд 25)*** і Нарачанскі нацыянальныя паркі ***(слайд 26)***.

Іх можна наведваць круглы год, атрымоўваць асалоду ад сустрэч з вельмі рэдкімі відамі флоры і фаўны, некаторыя з якіх захаваліся толькі на Беларусі...

*Дзеці глядзяць фотавыставу* ***«Белавежская пушча»*** *пад аўдыёсуправаджэнне (на* ***слайдзе 27*** *націскаецца спасылка).*

Ахоўваць прыроду, берагчы яе — гэта абавязак кожнага сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Наша краіна — квітнеючы куток Зямлі, няхай такой яна і застаецца...

**Вядучы:** Вялікі дзякуй, дарагія госці, за ўвагу. Мы запрашаем вас прыняць удзел у школьным конкурсе малюнкаў «Мураваная легенда» і конкурсе юных паэтаў «Мой родны кут, як ты мне мілы!».

***Сінькевіч Н. І.****, настаўніца беларускай мовы і літаратуры*
*СШ № 16 г. Мінска*